УДК (070 + 94) (476) “15/16”

# ПАЭТЫЧНЫЯ І ПРАЗАІЧНЫЯ ДЫЯРЫУШЫ РЭАКУПАЦЫІ СЕВЕРСКАГА ВАЯВОДСТВА Ў 1633 г.

**Еўмянькоў Віталь Іванавіч**
дацэнт кафедры літаратуры і міжкультурных камунікацый установы адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова”;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Магілёў, Беларусь)

*Ключавыя словы: Рэч Паспалітая, Жыгімонт IV, Смаленск, Шэйн, Радзівіл, Гансеўскі.*

*Аналізуюцца дакументы перыяду вызвалення Северскага ваяводства ад маскоўскага войска на чале з Шэйнам і Празароўскім. Цытуюцца арыгінальныя крыніцы 1634 года.*

У 1634 г. з’явілася некалькі дакументаў, прысвечаных супрацьстаянню з Масквой. Перадусім гэта “Новая песня, або Трыумф маскоўскі”[1] і “Навіна з Масквы праўдзівая, кароткім вершам выкладзеная…”[2]. Першы дакумент можна лічыць паэтычнай дэкларацыяй паспяховага маскоўскага паходу толькі што абранага караля; другі – паэтычным дыярыушам гісторыі рэакупацыі Северскай зямлі. Невядомы аўтар “Новай песні” прадэманстраваў бідавочны паэтычны талент, аднак не быў шчодры на інфармацыю. Гэты дакумент выконваў, хутчэй за ўсё, выключна ідэалагічную функцыю: даводзіў да рэцыпіента тое, што Уладзіслаў узяў у спадчыну ад свайго бацькі найбольш паспяховыя прыёмы вырашэння знешнепалітычных праблем.

Аўтар другога дакумента – вядомы польскі паэт эпохі Барока Генрык Чэлхоўскі / Henryk Chelchowski – наадварот, праявіў добрую абазнанасць у дэталях той ваеннай кампаніі, што сведчыць, на наш погляд, пра яго непасрэдны ўдзел у паходзе. Варта тут згадаць і тое, што Г. Чэлхоўскі вынес на тытул свайго выдання слова “навіна”, дадаўшы тое, што яна “праўдзівая”.

Пачынаецца “Новая песня…” з апісання падзей, якія распачаліся адразу пасля смерці Жыгімонта III Вазы (19 красавіка 1632 г.). Вялікі князь маскоўскі М.Ф. Раманаў разарваў мір з Рэччу Паспалітай, мяркуючы, што смерць караля – гэта і канец перамір’я. “Думалі яны [маскоўцы – В.Е.], што пры абранні новага караля на соймах праміне шмат часу, і Рэч Паспалітая не здолее сабраць дастаткова сіл, каб паспяхова весці вайну” [1, с. 56].

М.Б. Шэйн “Смаленск прымушаў здацца”, пачынаючы з 14 лістапада 1632 года[3] [1, с. 53]. Уладзіслаў IV прыбыў у абоз польска-літоўскага войска

[1] NOWA PIESN. Abo TRYVMPH MOSKIEWSKI.

[2] WIESC Z MOSKWY PRAWDZIWA. Krotkim HENRYKA CHELCHOWSKIEGO Rymem Wyprowadzona. Roku Páńskiego M.DC.XXXIIII. W THORUNIU, Apud Franciscum Schnellboltz.

[3] Пачатак рэгулярнай аблогі Смаленска.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

толькі 2 верасня 1633 года [1, с. 60]. І гэта пры тым, што каранацыйны сойм завяршыўся 17 сакавіка 1633 года [1, с. 53]. Паміж каранацыяй (6 лютага 1633 г.) і з'яўленнем Уладзіслава на вайну прайшло амаль палова года. Таму заўвага аўтара адносна таго, што кароль нібыта дужа спяшаўся бараніць край ("Толькі што на галаву ўздзеў ён цябе, // І дзеля абароны тваёй не шкадуе сябе") уяўляецца нам залішне катэгарычнай. Вось што на гэты конт у сваім дыярыушы паведамляе Альбрэхт Радзівіл: "Праз цэлы той месяц [жнівень. – *В.Е.*] лянівым крокам рухаўся кароль у бок Смаленска" [2, с. 171].

Пачатак "Навіны з Масквы..." Генрыка Чэлхоўскага, на першы пагляд, ніяк не звязаны з падзеямі восені 1634 г. На другім аркушы ён змяшчае геральдычны клейнод, трэба думаць, свайго мецэната, каралеўскага капітана, старасты тчэўскага Самуэля Станіслава Надольскага. Пасля чаго друкуе паэтычнае прысвячэнне яму ж, "міласціваму пану". Далей аўтар падае падрабязнае апісанне ўсіх этапаў ваенных дзеянняў.

Як вынікае, 7 верасня Радзівіл у неспадзяваным месцы пераходзіць праз Днепр і атакуе маскоўскія пазіцыі на ўзгорку, які меў назву "Пакравы". Займаў тыя пазіцыі аддзел немцаў на чале з генералам Мацісанам. Адначасова лагер Шэйна атакавалі прускія пехацінцы на чале з Оберштэрам, а лагер Празароўскага атачылі аддзелы Гансеўскага і Казаноўскага. Распачалася запеклая бітва. Вось як апісвае яе Г. Чэлхоўскі: "Паўстала тады масква ў мужнай справе // У акопах, на шанцах, на зялёнай мураве. // Каляровых мундзіраў, нямецкай пяхоты // Тут мала! Ды шмат тут жаўнерскае цноты. // <...> // Рыцары з палку пана Камянецкага[1] // Многа набілі люду маскоўскага. // Прыгожа яны іх мячамі свянцілі, // Праўда, і самі крывёй заплацілі.

Атака Крыштофа Радзівіла была настолькі магутнай, што ледзь не з першых хвілін літвінам і запарожскім казакам удалося адсунуць ворага назад, разарваць яго абарону. Дапамагла і смаленская залога. Колькі соцень вершнікаў на чале з заступнікам камандуючага гарнізонам Станіславам Ваяводскім выйшлі з брамаў і скінулі маскавітаў з моста, забраўшы дзве гарматы. "<...> шмат ворагаў трупам паклалі, праўда і самі тры сотні страцілі" [1, с. 63]. Самы галоўны вынік гэтай сумеснай атакі: у Смаленск увайшоў асабісты полк Яна Казіміра на чале з Дэнгофам, прывёзшы правіянт і порах.

На гэтым падзеі 7 верасня завяршыліся. Уладзіслаў вярнуўся за Днепр, дзе 9 верасня, паводле Альбрэхта Радзівіла, правёў ваенны савет. Недзе праз тыдзень пачаўся другі этап супрацьстаяння войска Рэчы Паспалітай з масквой. Зноў першым атакаваў Радзівіл, даслаўшы наперад казакаў разам з пяхотай. Хоць і з цяжкасцю, але казакам удалося захапіць мост і выбіць

[1] Хутчэй за ўсё маецца на ўвазе кашталян камянецкі Аляксандр Пясэчыньскі / Alexander Piaseczyński.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

маскавітаў з пазіцый. Працытуем дыярыўш А. Радзівіла: “21 верасня ваявода віленскі разам з казакамі на вялікі полк непрыяцельскі наехаў. Паколькі казакам сіл не хапіла, гетман Радзівіл пяхоту да іх даслаў. Гэтакім чынам падмацаваныя, казакі мост апанавалі. Вораг жа з сорамам уцёк” [2, с. 174].

Г. Чэлхоўскі гэты эпізод таксама згадвае. Аднак уся ўвага паэта канцэнтруецца вакол Уладзіслава IV, якога ён называе “мужным і справядлівым каралём-воінам”. Галоўная задача каралеўскіх харугваў заключалася ў штурме ўзгорка Пакравы. Дзякуючы таму, што палкі Радзівіла цалкам пазбавілі Мацісана магчымасці атрымліваць дапамогу ад Шэйна і Празароўскага, генерал пакінуў узгорак і адышоў да сваіх. Адбылося гэта 21 верасня. Вось як гэты момант убачыў Г. Чэлхоўскі: “Давялося пяхоце з масквой на шаблі ўзяцца, // У сечы лютай апошнім азартам трымацца. // Вока за вока, смерць за смерць – такі быў рахунак. // Да апошняга б нашы загінулі, калі б на паратунак // Пан польны гетман не даслаў пешых казакаў, // У жаўнерскай патрэбе дзельных юнакаў. // Але і казацкія роты не далі маскве рады. // Тады іншая пяхота з казацкіх атрадаў // Ударыла з другога боку і свайго дапяла – // З трох шанцаў масква хутка паўцякала”.

Да поўнай перамогі было яшчэ надта далёка. Асноўныя сілы маскавітаў нават не ўступілі ў бой. Крыштоф і толькі што вярнуўшыйся з пасольства ў Англіі Януш Радзівілы рваліся наперад. Прыблізна той самы настрой меў і Уладзіслаў. Калі верыць дыярыўшу Альбрэхта Радзівіла, генеральная бітва распачалася 28 верасня. Як вынікае, саступаць не хацелі ні маскавіты, ні войска Рэчы Паспалітай. Зноў сказалі сваё важкае слова жаўнеры Крыштофа Радзівіла, якія злучыліся з запарожцамі і атакавалі палкі Празароўскага. Нягледзячы на колькасную перавагу, маскавіты зноў мусілі адысці.

І гэта было, як сведчыць Альбрэхт Радзівіл, пачаткам канца маскоўскага войска. Празароўскі пакінуў у абозе “<…> Шмат жывёл, куль, кнотаў, з порахам, / Вазоў кінулі шмат з розным начыннем”. 4 кастрычніка еўрапейскія найміты на чале з генералам Леслі фактычна ўцяклі з-пад сцен Смаленска, пакінуўшы ўмацаванні, зброю, рыштунак. Шэйн, які аб’яднаў вакол сябе ўсё войска, замест таго каб контратакаваць, чакаў развіцця падзей у лагеры на Дзявочай горцы. Справа была зроблена. Фактычна, піша К. Квяткоўскі, Смаленск быў вызвалены [1, с. 68]. Працытуем Г. Чэлхоўскага: “Завяршылася тым, што масква цёмнай ноччу, // Паўцякала без сведкаў і відавочцаў. // Падпаліўшы шанцы і абознае майно…”.

Зрэшты, пра тое ж самае паведамляе і Альбрэхт Радзівіл, датуючы падзеі 29 і 30 вераснем (дзень Святога Міхала) [2, с. 176].

3 кастрычніка рэшты войска Празароўскага злучаюцца з асноўнымі сіламі ў абозе Шэйна на Дзявочай гары. Дзеля аховы Смаленска кароль пакідае ваяводу Гансеўскага, а сам з асноўнай часткай войска рухаецца



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ўслед за маскавітамі. Да канчатковай капітуляцыі Шэйна, пра якую піша аўтар "Новай песні…", яшчэ дужа далёка – прыблізна палова года.

**Літаратура**


1. Kwiatkowski, K. Dzieje narodu polskiego za panowania Władysława IV. Krola polskiego i szweckiego / K. Kwiatkowski. – Warszawa : nakładem i drukiem N. Glücksberga, 1823. – 476 s.
2. Pamiętniki Albrychta Stanisława X. Radziwiłła kanclerza W. Litewskiego / Wydane z rękopismu przez Edwarda Raczyńskiego. – T. 1. – W Poznaniu : u braci Scherków, 1839. – 435 s.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова